# КАШТОЎНАСНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле прадстаўлены аўтарскі погляд на раённую газету як асаблівы і вельмі значны сегмент сучаснай нацыянальнай медыяпрасторы; вызначаны асаблівасці дзейнасці рэдакцый мясцовых выданняў з пункту гледжання фарміравання духоўных, прафесійных і грамадскіх каштоўнасцей.

***Ключавыя словы:*** раённая газета; рэгіён; сацыяльна-эканамічнае развіццё; стратэгіі; функцыі; духоўныя каштоўнасці; грамадскія каштоўнасці.

# VALUE POTENTIAL OF A REGIONAL NEWSPAPER

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article presents the author’s view of a regional newspaper as a special and very significant segment of modern national media space. Features of the activities of the editorial offices of local publications in terms of the formation of spiritual, professional and social values are determined.

***Key words:*** regional newspaper; region; socio-economic development; strategies; functions; spiritual values; social values.

Павышэнне грамадскага і навуковага інтарэсу да рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі ў апошні час абумоўлена шэрагам аб’ектыўных прычын. Так, стратэгія дзяржаўнага развіцця Рэспублікі Беларусь накіравана на рэгіёны, якія павінны стаць моцнымі эканамічнымі цэнтрамі ў агульнай сістэме краіны. Для вырашэння гэтай задачы распрацаваны шэраг нарматыўна-прававых актаў, даволі паспяхова рэалізуюцца інавацыйныя праекты, накіраваныя на развіццё найноўшых прагрэсіўных тэхналогій, іх укараненне ў прамысловасць і сельскую га-

спадарку. Кожнае мясцовае выданне сёння прымае самы актыўны ўдзел у жыццядзейнасці свайго краю, ствараючы яго аб'ектыўную панараму.

Нельга не адзначыць, што тая інфармацыйная палітыка, якую рэалізуюць сродкі масавай інфармацыі ў рэгіёнах краіны, з'яўляецца на самай справе ўнікальнай. Яе выключнасць якраз у падыходах рэдакцый да мадэлявання тэматычнага зместу выданняў. У раённай прэсе яно характарызуецца шэрагам адрозненяў ад цэнтральнай грамадска-палітычнай. Так, тэматычныя блокі раённых газет аб'ектыўна фарміруюцца на падставе інфармацыйных, сацыяльных, эканамічных і культурных запатрабаванняў. У дадзеным выпадку на першае месца выходзіць катэгорыя запатрабаванасці і актуальнасці матэрыялу, а не толькі інфармацыйная нагода, якая часта пераважае ў цэнтральнай прэсе. Такім чынам забяспечваецца дастаткова аб'ектыўнае інфармаванне аб падзеях у рэгіёне. Фарміраванне кантэнту рэгіянальных выданняў адбываецца і з улікам меркаванняў органаў мясцовай улады, што таксама мае свае станоўчыя рысы і амаль выключае фармальны падыход да асвятлення падзей.

Яшчэ адна асаблівасць рэдакцый раённых газет – гэта, як правіла, невялікі склад супрацоўнікаў. Але ў гэтым якраз і плюсы. Так, практычна кожны карэспандэнт – асоба вядомая, знаёмая многім, нарэшце, аўтарытэтная не толькі ў шэрагах калег-журналістаў, але і на ўзроўні мясцовых выканкамаў, школ, культурна-асветных устаноў і г. д. Такім чынам, можна гаварыць пра асаблівую, вельмі высокую, ступень адказнасці калектыву, што таксама аб'ектыўна станоўча характарызуе выданне.

Жыхары невялікіх тэрыторый праяўляюць вялікую зацікаўленасць да ўсяго, што там адбываецца, даволі добра ведаюць практычна кожнага прадстаўніка сацыяльна значных прафесій не толькі як спецыяліста, але і як чалавека. Менавіта таму раённыя газеты сёння з'яўляюцца своеасаблівым асяродкам журналістыкі грамадскай, «з чалавечым тварам», чаго так не хапае. Такая інфармацыйная стратэгія, накіраваная якраз на фарміраванне грамадскай свядомасці, у сучасных умовах мае большую каштоўнасць, чым укараненне ў практыку рэдакцый найноўшых тэхналогій, хаця зніжаць значэнне апошняга ніяк нельга.

У гэтай сувязі звяртае на сябе ўвагу яшчэ адна вельмі каштоўная сёння функцыя раённай газеты як захавальніка традыцый, духоўных і грамадскіх каштоўнасцей народа. Ва ўсе складаныя перыяды гісторыі насельніцтва невялікіх гарадоў, мястэчак і вёсак накоплівала вопыт

пакаленняў, узбагачаючы скарбніцу нацыянальнай культуры. Сёння менавіта раённыя газеты, ствараючы панараму сучаснага жыцця, выконваюць каласальную працу па вывучэнні гісторыі свайго краю, расказваючы пра сучаснікаў і іх знакамітых продкаў. Выклікае вялікую павагу і ўдзячнасць менавіта такая дзейнасць рэдакцый, паколькі яна напрамую ўплывае на фарміраванне грамадзянскага светапогляду чалавека, яго асабістых прыярытэтаў і каштоўнасцей. У прагматычным часе, дзе стаўленне да духоўнага жыцця ў грамадстве даволі абыякавае, зварот да асобы, жаданне яе зразумець і падтрымаць – вельмі каштоўная з'ява.

Маральна-этычны стан сучаснага грамадства характарызуецца як даволі нетрывалы, нават негатыўны, вельмі часта людзі ўказваюць на адсутнасць стымулаў для далейшага самаўдасканалення і развіцця. Паступовая пераацэнка каштоўнасцей, якая адбылася пад уплывам рэалій жыцця, прыводзіць да паступовай страты духоўнасці, цікавасці да чалавека ўвогуле, яго інтарэсаў, памкненняў, сацыяльнай значнасці. Многія аўтарытэтныя вучоныя і журналісты даволі часта адзначаюць, што з ростам матэрыяльнага дабрабыту людзей зніжаецца іх задаволенасць уласным жыццём. Не трэба нікога пераконваць у тым, што дадзеная тэндэнцыя ці нават ужо заканамернасць з'яўляецца даволі небяспечнай, не толькі прыводзіць да духоўнай дэградацыі, але і пагражае стратай сацыяльнай стабільнасці. Абстаноўка напружання, палітычнага супрацьстаяння, якая назіралася ў нашай краіне ў апошні час, стала вынікам, у тым ліку, і духоўнага крызісу, які перажывае сучаснае грамадства. І гэта актуальна не толькі для Беларусі, але і для шэрагу іншых краін, нават тых, дзе ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва значна вышэйшы. Такім чынам, паўнацэннае духоўнае развіццё чалавека ўмацоўвае яго грамадскую свядомасць, спрыяе фарміраванню лепшых чалавечых і грамадзянскіх якасцей, галоўнай з якіх, безумоўна, з'яўляецца патрыятызм.

Прыведзеныя вышэй акалічнасці выклікаюць неабходнасць падысці сёння з новых пазіцый да навуковага асэнсавання дзейнасці рэгіянальнага друку, яго ролі ў фарміраванні грамадзянскіх і агульначалавечых каштоўнасцей. За доўгі перыяд гісторыі кожнай беларускай раённай газетай назапашаны велізарны вопыт па асвятленні розных сфер жыцця свайго рэгіёна, і гэты вопыт неабходна развіваць на сучасных інфармацыйных платформах, у выданнях іншага тыпу.